# Весці

## БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДАГАГІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА

## № 4 (30) 2001

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**



***Галоўны рэдактар:***
Л. Н. Ціханаў

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. Г. Алоўнікава
Г. А. Баўтута
В. А. Бондар (*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў (*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
Т. А. Грыгор'ева
Я. Л. Каламінскі
Л. А. Кандыбовіч
Н. І. Копысава (*адказны сакратар*)
Г. А. Космач
І. А. Новік
А. У. Рагуля
М. Т. Стэльмашук
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
І. І. Цыркун
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. С. Яўневіч


## ЗМЕСТ


***Педагогіка***

*Цімашкова Л. М.* Рэфлексіўна-дзейнасны падыход у вывучэнні педагагічных дысцыплін як умова фарміравання камунікатыўнай кампетэнтнасці будучых настаўнікаў..............3

*Каравай І. У.* Вопыт арганізацыі вучэбна-творчай дзейнасці студэнтаў у працэсе вывучэння педагагічных дысцыплін ........10

*Скорыкава А. І.* Камп'ютэрныя тэхналогіі як сродак фарміравання духоўнага свету асобы вучня..........................19

*Сярнова Т. В.* З вопыту вакальнай работы са студэнтамі прафесара Т. М. Ніжнікавай..............................................25

*Лихачева С. Н.* Особенности социального становления выпускников интернатских учреждений...........................30

*Асаенок И. С., Жалковский В. И.* Особенности организации научно-исследовательской работы студентов на непрофилирующей кафедре.............................................33

***Псіхалогія***

*Мышко О. П.* Структура и виды речевой деятельности.........36

*Шлыкова Т. Ю.* Осознание подростками причин успехов и неудач и его роль в формировании личности ...........43

***Дэфекталогія***

*Гіруцкі І. А.* Псіхалагічныя асаблівасці моўнага мыслення і яго спецыфіка ў дзяцей з першаснай інтэлектуальнай недастатковасцю ..............................................................50

***Моваазнаўства***

*Урбан В. В.* Асаблівасці семантыкі ацэначнай лексікі ..........55

*Слабко І. У.* Мадэлі і варыянты камбінаваных сінтаксічных канструкцый ...........................................................59

*Курилова Л. Н.* Ударение в предложно-именных формах......63

*Портнова А. В.* Вопросы исторической лексикологии в восточнославянской лингвистической литературе XIX—XX вв. (аспекты изучения абстрактной лексики)....................70

***Сацыялогія***

*Зенчанка В. А.* Працэсы трансфармацыі ў сучасным беларускім грамадстве і праблемы фарміравання палітычнай культуры моладзі..........................................................78

*SUMMARY*

*The youth as the subject of social activity realizes its vital potential as the necessity of self-perfection. Determination of its social activity is connected with real processes occurring in our society, in which it is involved and in which it plays not the last role. The behaviour of the young men and girls is also affected by their age features. The activity of youth is not only the contribution to the decision of today's problems. They act as harbingers of life in the nearest future, the time when they will carry responsibility for the destiny of their country.*


УДК 316.356.2

*Н. В. Паўлава, Л. М. Ракіцкая*

# СЯМ'Я ЯК АБ'ЕКТ САЦЫЯЛАГІЧНАГА ЗНАЧЭННЯ

Сацыялогія сям'і — галіна сацыялагічных ведаў, якая вывучае фарміраванне, развіццё і функцыянаванне сям'і, шлюбна-сямейных зносін у канкрэтных сацыяльна-эканамічных і культурных умовах. Як частка агульнай сацыялогіі яна разглядае сферу жыццядзейнасці і культуры згодна з дзеючай групай людзей, звязаных сямейна-сваяцкімі адносінамі, фіксуючы пры гэтым увагу на сямейным спосабе жыцця.

Сям'я з'яўляецца неабходным кампанентам сацыяльнай структуры любога цывілізаванага грамадства. Яна выконвае важныя функцыі «производства самого человека, продолжения рода» і спалучае ў сабе індывідуальны і калектыўны пачаткі, выступае звяном, якое звязвае не толькі біялагічнае і сацыяльнае, але і сама індывідуальнае і грамадскае жыццё людзей. Сям'я можа разглядацца і як сацыяльная група, і як сацыяльны інстытут.

Сям'я як малая сацыяльная група — гэта нешматлікае згуртаванне людзей, якія звязаны шлюбнымі і сваяцкімі адносінамі, агульнасцю быту і ўзаемнай маральнай адказнасцю перад грамадствам у фізічным і духоўным узнаўленні насельніцтва; гэта згуртаванне, якое характарызуецца асаблівай структурай, пэўным наборам відаў дзейнасці і спецыфічнай сукупнасцю норм і каштоўнасцяў. Сям'я як група функцыянуе дзякуючы дзейнасці іх членаў, іх узаемадзеянню і зносінам.

Сям'я як сацыяльны інстытут уключае інстытут шлюбу, сваяцтва, мацярынства і бацькоўства, уласнасці, дзяцінства, сацыяльнай аховы, апекі і г. д. Гэта адзін з найбольш старажытных сацыяльных інстытутаў, якія ўзніклі у першабытным грамадстве (раней за класы, нацыі і дзяржавы). Як інстытут, санкцыяніруемы грамадствам, сям'я выступае складанай часткай, элементам

усяго грамадства. На першых этапах развіцця грамадства адносіны паміж жанчынай і мужчынам, старэйшым і малодшым пакаленнямі рэгуляваліся племяннымі і родавымі звычаямі, якія грунтаваліся на рэлігійных і маральных уяўленнях. З узнікненнем дзяржавы рэгуляванне сямейнага жыцця набыло прававы характар. З гэтага часу сацыяльны кантроль і санкцыі ажыццяўляліся не толькі грамадскай думкай, але і дзяржаўнымі органамі.

У літаратуры існуюць розныя пункты гледжання (версіі) на тое, якой была гістарычна пачатковая форма сям'і і шлюбу. З антычнасці да сярэдзіны XIX ст. сям'ю лічылі мініяцюрным правобразам грамадства, само ж грамадства ўяўлялася як сям'я, якая разраслася ўшырыню. З сярэдзіны XIX ст. абстрактныя схемы ў вывучэнні сям'і ўступілі месца канкрэтным фактам. Складваецца паняційны апарат сацыялогіі сям'і. Свой уклад у яе развіццё ўнеслі Л. Морган («Першабытнае грамадства»), Ф. Энгельс («Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы»), Э. Дзюркгейм («Уводзіны ў сацыялогію сям'і»), М. Вебер («Жонка і маці ў прававым развіцці»), У. Гудсела («Гісторыя шлюбу і сям'і»), С. Цымерман («Сям'я і цывілізацыя») і іншыя вучоныя.

Сістэматычнае даследаванне сям'і пачалося ў канцы XIX — пачатку XX ст. Да пачатку XX ст. канчаткова замацаваўся адыход ад абстрактных схем у бок канкрэтна-гістарычнага аналізу сям'і.

У замежнай сацыялогіі XX ст. вывучэнне праблем сям'і і шлюбу займае адно з першых месц у навуковых даследаваннях сацыяльнага жыцця. Сацыялогія сям'і — адна з найбольш развітых галін сацыялагічных ведаў. Асабліва вялікія поспехі сацыялогіі сям'і ў ЗША, дзе кожны год выдаецца да 700 кніг і артыкулаў, прысвечаных тэарэтычным і эмпірычным пытанням амерыканскай сям'і. У 95 універсітэтах ЗША чытаецца спецыяльны курс «Сям'я і шлюб». Пад кіраўніцтвам вядомых амерыканскіх даследчыкаў Р. Хіла і Д. Хансена адбываецца сістэматызацыя і аналіз даследаванняў па сям'і, якія праводзяцца ў ЗША, Еўропе, Азіі. Сям'я разглядаецца як планетарная з'ява.

Вывучэнне праблем сямейнага жыцця складае самастойную галіну навукі ў Японіі. Даследаванні праводзяць не толькі прадстаўнікі сацыялагічнай службы, але і дзяржаўныя ведамствы, банкі, страхавыя кампаніі, грамадскія арганізацыі і палітычныя партыі. У Японіі дасканалае вывучэнне самых дробных дэталяў сямейнага жыцця параўноўваюць з даследаваннем таямніц прыроды. Камітэт па вывучэнні палітыкі прэм'ер-міністра кожны год робіць даклады па ўдасканальванні асноў сям'і.

У развітых краінах навуковыя даследаванні па праблемах сям'і служаць трывалай асновай для іх сацыяльнай палітыкі. З сярэдзіны XX ст. праблемы сям'і становяцца ўсё больш акту-

...льнымі ў краінах Усходняй Еўропы (Ф. Знаноцкі, А. Класкоў-...кі, Д. Маркоўскі, З. Тышка (Польшча)). У былым СССР скажэн-...е метадалагічных пасылак вывучэння сям'і, спробы літараль-...ага прытрымлівання на практыцы міфалагізаванай мадэлі са-...цыялістычнай сям'і прывялі да імкнення ў кароткі гістарычны ...эрмін дасягнуць абсалютнай роўнасці ў сферы сямейных адно-...сін, да спробы аднесці сямейныя адносіны да другарадных з'яў. ...а агульнапрынятай тэарэтычнай схеме сацыялістычная сям'я, ...ызваленая ад прыватнай уласнасці, стала адлюстроўвацца ...толькі як спажывецкая ячэйка; сям'я ва ўмовах сацыялізму ...грунтуецца не на эканамічных адносінах, а толькі на духоўна-...маральных. Гэта памылковая думка існуе і сёння.

Тэарэтычна абгрунтоўвалася пагарджанне грамадства надзён-...нымі патрэбамі сям'і, сцвярджалася, што паколькі інтэнсіўна ...дзе ператварэнне дробнай дамашняй гаспадаркі ў буйную гра-...мадскую, то няма неабходнасці развіваць сістэму абслугоўвання ...індывідуальнага сямейнага быту. Вынікі сацыяльнай палітыкі, ...аснаванай на гэтых тэарэтычных высновах, сям'я адчувае ў поў-...най меры і ў наш час.

У ацэнцы цяперашняга стану сярод сацыёлагаў і дэмографаў распаўсюджаны такія пункты гледжання, як аптымістычны, сутнасць якога заключаецца ў тым, што сям'я як гістарычны са-...цыяльны інстытут мяняе свае формы і функцыі, але з-за аб'ек-...тыўных патрэбнасцяў яна захоўваецца і будзе захоўвацца ў буду-...чым; і песімістычны, прыхільнікі якога лічаць, што традыцый-...ная сям'я распадаецца і працэс гэты можна толькі затармазіць, але не спыніць.

Сацыялагічнае вывучэнне сямейна-шлюбных адносін праду-...гледжвае даследаванне функцый, тыпалогіі сям'і і шлюбу. Сацы-...яльныя функцыі сям'і адлюстроўваюць усе аспекты яе жыцця-...дзейнасці: сацыяльна-эканамічныя, дэмаграфічныя, выхаваўчыя, ...маральна-псіхалагічныя, духоўна-эмацыянальныя. Грамадства ...ўяўляе сабой кангламерат сем'яў і індывідуумаў з розным узроў-...нем матэрыяльнай забяспечанасці, рознымі інтарэсамі.

Усе цывілізаваныя народы маюць манагамны шлюб. Манага-...мія — гэта самы распаўсюджаны і пажаданы тып шлюбу; гэта ...з'ява планетарная, таму можна гаварыць аб агульных рысах, ха-...рактэрных для сучаснага этапа яе існавання:

Пераход ад патрыярхальнай формы манагаміі да партнёрскай ...сям'і.

Разбурэнне шматвяковых традыцый сямейных адносін, за-...снаваных на патрыярхальных каштоўнасцях, і замена іх новымі, ...дэмакратычнымі.

Пераход ад індывідуальна-сямейнай формы вытворчасці да ...грамадска-індывідуальнай. Гэта кардынальна змяніла адносіны

«сям'я — грамадства» і прывяло да змен сям'і на структурным функцыянальным узроўнях. Рэзка змяніліся ўнутрысямейныя функцыі мужа і жонкі. Адбылася страта патрыярхальнай ролі бацькі і мужа ў сям'і ў сувязі з узрастаннем мацярынскага ўдзелу ў забеспячэнні эканамічнага дабрабыту сям'і, што выклікала вострую сацыяльную праблему шлюбнай няроўнасці пры новых сямейных адносінах.

Страта манагаміяй у сучасных умовах свайго пажыццёвага характару. З'явілася магчымасць уступаць у паўторныя шлюбы. Шлюб стаў супрацьпастаўляцца сям'і. Эвалюцыя адносін паміж паламі прывяла да распаўсюджвання шлюбаў, свабодных ад сексуальных абавязацельстваў, росту дашлюбных і пазашлюбных сувязяў. Гэтыя з'явы можна разглядаць як пэўную дэградацыю агульначалавечых маральных каштоўнасцяў. Але, на нашу думку, такія негатыўныя змяненні не трэба драматызываць, бо гэта працэс развіцця сямейных адносін ад патрыярхальнай скаванасці да раўнапраўя. Аргументам на карысць такой ацэнкі служыць захаванне і развіццё інстытута шлюбу.

1. Ломка традыцыйных адносін «бацькі — дзеці», якія былі стрыжнем патрыярхальнай сям'і. Гэтаму садзейнічалі функцыянальныя і структурныя змяненні. Сям'я перастала быць сферай уключэння маладога пакалення ў прафесійную і культурную традыцыі. Узрасла роля грамадскіх інстытутаў — дзіцячых выхаваўчых устаноў, школ, ВНУ, сродкаў масавай інфармацыі. Узнік дэфіцыт жывога кантакта дзяцей з бацькамі, у выніку чаго ўзрос уплыў на сацыялізацыю нефармальных груп.

Змяненне функцыянальных бацькоўскіх роляў паўсюдна звязана з дамінаваннем маці ў доглядзе за дзіцем, выхаванні, вядзенні хатняй гаспадаркі; перавагай мацярынскіх кантактаў з дзіцем. Унутрысямейная фемінізацыя выхавання знізіла ролю бацькі ў многіх сем'ях.

З другога боку, у дэмакратычных сямейных саюзах выхаваўчая роля бацькі, з'яўляючыся элементам кааперацыі сямейнай працы, у апошні час узрасла. Пры гэтым дэмакратызацыя сямейных адносін цесна звязана з дэмакратызацыяй і гуманізацыяй выхавання дзяцей.

У гэтых новых умовах нярэдка аслабляюцца маральныя сувязі паміж бацькамі і дзецьмі, адбываецца страта бацькоўскага аўтарытэту, адыход дзяцей у маладзёжную, падлеткавую субкультуру (наркатычную, крымінальную).

2. З'яўленне тэндэнцыі, звязанай з ростам аўтаноміі пакаленняў. З аднаго боку, адышлі ў мінулае ўстаноўкі бацькоў, калі інтарэсы дзяцей ставіліся вышэй за ўласныя, з другога — дзеці не адчуваюць абавязкаў перад бацькамі, якія падрыхтавалі іх да самастойнага жыцця.

«сям'я — грамадства» і прывяло да змен сям'і на структурных функцыянальным узроўнях. Рэзка змяніліся ўнутрысямейныя функцыі мужа і жонкі. Адбылася страта патрыярхальнай ролі бацькі і мужа ў сям'і ў сувязі з узрастаннем мацярынскага ўдзелу ў забеспячэнні эканамічнага дабрабыту сям'і, што выклікала вострую сацыяльную праблему шлюбнай няроўнасці пры новых сямейных адносінах.

Страта манагаміяй у сучасных умовах свайго пажыццёвага характару. З'явілася магчымасць уступаць у паўторныя шлюбы. Шлюб стаў супрацьпастаўляцца сям'і. Эвалюцыя адносін паміж паламі прывяла да распаўсюджвання шлюбаў, свабодных ад сексуальных абавязацельстваў, росту дашлюбных і пазашлюбных сувязяў. Гэтыя з'явы можна разглядаць як пэўную дэградацыю агульначалавечых маральных каштоўнасцяў. Але, на нашу думку, такія негатыўныя змяненні не трэба драматызываць, бо гэта працэс развіцця сямейных адносін ад патрыярхальнай скаванасці да раўнапраўя. Аргументам на карысць такой ацэнкі служыць захаванне і развіццё інстытута шлюбу.

1. Ломка традыцыйных адносін «бацькі — дзеці», якія былі стрыжнем патрыярхальнай сям'і. Гэтаму садзейнічалі функцыянальныя і структурныя змяненні. Сям'я перастала быць сферай уключэння маладога пакалення ў прафесійную і культурную традыцыі. Узрасла роля грамадскіх інстытутаў — дзіцячых выхаваўчых устаноў, школ, ВНУ, сродкаў масавай інфармацыі. Узнік дэфіцыт жывога кантакта дзяцей з бацькамі, у выніку чаго ўзрос уплыў на сацыялізацыю нефармальных груп.

Змяненне функцыянальных бацькоўскіх роляў паўсюдна звязана з дамінаваннем маці ў доглядзе за дзіцем, выхаванні, вядзенні хатняй гаспадаркі; перавагай мацярынскіх кантактаў з дзіцем. Унутрысямейная фемінізацыя выхавання знізіла ролю бацькі ў многіх сем'ях.

З другога боку, у дэмакратычных сямейных саюзах выхаваўчая роля бацькі, з'яўляючыся элементам кааперацыі сямейнай працы, у апошні час узрасла. Пры гэтым дэмакратызацыя сямейных адносін цесна звязана з дэмакратызацыяй і гуманізацыяй выхавання дзяцей.

У гэтых новых умовах нярэдка аслабляюцца маральныя сувязі паміж бацькамі і дзецьмі, адбываецца страта бацькоўскага аўтарытэту, адыход дзяцей у маладзёжную, падлеткавую субкультуру (наркатычную, крымінальную).

2. З'яўленне тэндэнцыі, звязанай з ростам аўтаноміі пакаленняў. З аднаго боку, адышлі ў мінулае ўстаноўкі бацькоў, калі інтарэсы дзяцей ставіліся вышэй за ўласныя, з другога — дзеці не адчуваюць абавязкаў перад бацькамі, якія падрыхтавалі іх да самастойнага жыцця.

Большасць бацькоў і іх дарослых дзяцей лічаць, што яны павінны жыць самастойна, а бацькі не павінны заставацца разам толькі з-за дзяцей.

Сучасныя змяненні ў сямейным жыцці маюць гістарычныя вынікі. Развіццё манагаміі ў наш час ажыццяўляецца праз крызіс і разбурэнне патрыярхальных функцый і структур. Пры гэтым інстытут шлюбу захаваўся і яго далейшае функцыянаванне забяспечваецца ўзмацненнем дэмакратычнай тэндэнцыі ў сферы сямейных адносін.

Сацыялізацыя новых пакаленняў выступае адной з функцый сям'і як сацыяльнага інстытута. Падрыхтоўка падрастаючага пакалення да дарослага жыцця заключаецца ў яго далучэнні да сацыякультурных роляў мужчыны і жанчыны, будучага сямейнага жыцця, а таксама ў фарміраванні паўнацэннай асобы.

Да жыццёва важных сацыяльных каштоўнасцяў адносяцца: ліквідацыя дыскрымінацыі пры працаўладкаванні мужчыны і жанчыны; стварэнне раўнапраўных умоў для павышэння іх кваліфікацыі і прафесійнай падрыхтоўкі; умацаванне ролі сям'і ў грамадстве; суверэнітэт сям'і, г. зн. абмежаванне якога-небудзь умяшання заканадаўца, грамадскай думкі, палітычных арганізацый і г. д. у справы сям'і; суверэнітэт асобы, г. зн. недапушчальнасць мер, якія абмяжоўваюць свабоду адных членаў сям'і на карысць іншых; пашырэнне свабоды выбару; сацыяльная абароненасць сям'і (асобныя катэгорыі сем'яў — няпоўныя; шматдзетныя; сем'і, у склад якіх уваходзяць інваліды, састарэлыя; сем'і, якія чакаюць нараджэння дзіцяці або ў якіх яно ўжо нарадзілася; якія не працуюць ці жывуць ва ўмовах стыхійнага або сацыяльнага бедства).

Дзяржава павінна будаваць палітыку так, каб сям'я магла разлічваць перш за ўсё на свае магчымасці, а яны могуць з'явіцца ў сям'і ў тым выпадку, калі дзяржава створыць неабходныя для яе ўмовы: эканамічныя, сацыяльныя, прававыя.

Дзяржаўныя структуры, на жаль, не ствараюць нават мінімальных умоў для выжывання сям'і. Яна павінна мець права самой вырашаць: працаваць ёй у грамадскай вытворчасці, займацца прыватным бізнесам або арганізаваць уласнае сямейнае прадпрыемства. Сёння дзяржаўныя органы знаходзяць сотні магчымасцяў, каб умешвацца ў жыццё сямейных гаспадарчых прадпрыемстваў, свабоднае прадпрымальніцтва. Зніжэнне эканамічнай актыўнасці жанчын тлумачыцца іх крайняй загружанасцю хатнімі справамі з прычыны цяжкага матэрыяльнага становішча, нежаданнем работадаўцаў прымаць на працу жанчын, каб не даваць адпачынкаў па цяжарнасці, родах і доглядзе за дзіцем.

Далейшае развіццё грамадства і яго ўзрастаючыя патрэбнасці патрабуюць усё новых рэсурсаў, асабліва інтэлектуальных. Вялі-

кія магчымасці ў гэтым плане адкрывае выкарыстанне патэнцыялу жаночага насельніцтва, які ў значнай ступені застаецца незапатрабаваным.

У наш час пачатак прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці дае магчымасць ператварыць частку дробных дзяржаўных прадпрыемстваў у хатнія гаспадаркі.

Падняццю эканамічнай самастойнасці сям'і ва ўмовах пераходу да рынчнай эканомікі садзейнічаюць розныя віды ўласнасці, кааператывы, сямейныя прамысловыя і гандлёвыя прадпрыемствы, фермерскія гаспадаркі, у дзяржаўным сектары — сямейны падрад, надомная вытворчасць, стымуляванне дробнага бізнесу ў сферы бытавых, дзелавых і адукацыйных паслуг. У свеце назапашаны немалы вопыт дзяржаўнага садзейнічання фарміраванню дробнага бізнесу, характэрнага ў нашай краіне для развіўранай сферы бытавых паслуг.

Вяртанне ў сям'ю вытворчай функцыі мае станоўчыя моманты ў сацыяльным і выхаваўчым планах. Гэта аб'яднанне сям'і ў межах працоўнай дзейнасці, далучэнне дзяцей да працы, вяртанне да сямейных каштоўнасцяў, якія ўключаюць адказнасць бацькоў за выхаванне дзяцей і ўдзел у станаўленні асобы, маральна-псіхалагічная падтрымка членаў сям'і, арганізацыя і выкарыстанне свабоднага часу, духоўнае ўзаемнае ўзбагачэнне.

Сям'я як сацыяльна-псіхалагічная супольнасць знаходзіцца ў працэсе фарміравання новай мадэлі міжасобаснага ўзаемадзеяння мужа і жонкі, бацькоў і дзяцей. На жаль, многія сем'і яшчэ з'яўляюцца кансерватыўна-таталітарным інстытутам, устаноўкі якога яўна адстаюць ад патрабаванняў сучаснага грамадства; сям'я крайне аслаблена для выканання паўнацэннай выхаваўчай функцыі як з-за ўнутранай нетрываласці, так і ў выніку каштоўнаснага вакууму, які бацькі большасці сям'яў аказаліся не ў стане запоўніць; сям'я мае вельмі малыя магчымасці ў матэрыяльным забеспячэнні і падтрымцы сваіх дзяцей.

Сучасная сям'я перажывае перыяд пераходу ад традыцыйнай мадэлі сямейнай арганізацыі да новай. Знікае традыцыйны тып сям'і, спрашчаецца яе структура, змяняецца сістэма ўлады і падпарадкавання, сям'я ўсё больш становіцца псіхалагічным прытулкам чалавека.

Па даных сацыялагічнага апытання студэнтаў 5 факультэтаў БДПУ па праблеме «Сям'я ў новых умовах», большасць маладых людзей разумеюць, што сям'я ў наш час адыгрывае тую ж ролю, якую павінна выконваць у любым грамадстве. Маецца на ўвазе працяг роду, псіхалагічны прытулак, добразычлівае акружэнне прадстаўнікоў старэйшага пакалення, клопат аб малодшых і старэйшых членах сям'і.

На жаль, сям'я як сацыяльны інстытут яшчэ не стала аб'ектам дзяржаўнай палітыкі. Але няма сумнення ў тым, што сацыяльная палітыка павінна ажыццяўляцца з улікам разнастайных умоў жыцця сям'і. Намаганні па забеспячэнні аднолькавых магчымасцяў мужчынам і жанчынам не павінны аддзяляцца ад працэсу змен у пераходны перыяд.

Чым паўней будуць раскрывацца дэмакратычныя прынцыпы грамадскага развіцця, тым больш акрэсленай будзе тэндэнцыя дэмакратычнага сямейнага саюза. Ад таго, наколькі поўна і добрасумленна сям'я выконвае свае функцыі і задавальняе свае патрэбнасці, у многім залежыць сацыяльны дабрабыт кожнай сям'і і грамадства ў цэлым.

*ЛІТАРАТУРА*


1. *Энгельс Ф.* Происхождение семьи, частной собственности и государства // Маркс К., Энгельс Ф. Соч. Т. 21. С. 26.
2. *Антонов А. И.* Микросоциология семьи. М., 1998.
3. *Антонов А. И., Медков В. М.* Социология семьи. М., 1996.
4. Женщины в переходный период. М., 1999.
5. *Мацковский М. С.* Социология семьи. Проблемы теории, методологии, методики. М., 1989.
6. *Савинов Л. И.* Семья и общество: история современности и взгляд в будущее. Саранск, 1992.



*SUMMARY*

*Interalation between social development and family evolution is analyzed. Specific character of a family as a social institution and a small social group. Family relations in modern society, family place in a value system of modern youth, social aspects of family politics are analyzed.*


УДК 316.48

*Г. І. Сцяпанаў*

# АЦЭНАЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА САЦЫЯЛЬНЫХ КАНФЛІКТАЎ І ІХ ВЫНІКАЎ У СУЧАСНАЙ САЦЫЯЛОГІІ

Да нядаўняга часу ў айчынным грамадазнаўстве амаль не надавалі ўвагі сацыяльным канфліктам, якія, тым не менш, мелі канкрэтны ці адчувальны характар у жыцці савецкага грамадства. Гэта праблема была актуальнай толькі для капіталістычных краін. Што тычыцца нашай рэчаіснасці, то тут нібы панавалі мір і спакой, ніякіх канфліктаў і быць не магло. Паводле дагматыза-